Источник: **«Рэспубліка» - 2012-09-19**

# «Я сэрцам пісаў сваю кожную песню…»

***Марына БАРАДАЎКА, «Р»***



**Рэспубліканскае свята паэзіі і песні з такой назвай прайшло ў Мядзелі напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма Танка.**

З нагоды гэтай даты на радзіме славутага класіка айчыннай літаратуры і вядомага грамадскага дзеяча, па ўсёй рэспубліцы адбылося шмат цікавых падзей і сустрэч. Свята песні і паэзіі стала своеасаблівай кульмінацыяй юбілейных мерапрыемстваў.

У гэты дзень шмат кветак лягло да магілы Максіма Танка, шмат шчырых слоў было сказана пра яго. І, вядома ж, гучалі пранікнёныя вершы славутага майстра. Вельмі кранальнай стала цырымонія адкрыцця каменя ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта.

Творчасць аднаго з найярчэйшых паэтаў у беларускай літаратуры натхніла яго прыхільнікаў на арыгінальныя падыходы да таго, каб выказаць сваё захапленне. Выстава па выніках фотапленэра «Дарогамі Максіма Танка» і выстава кветкавых кампазіцый па матывах яго твораў, літаратурна-мастацкая гасцёўня «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма…», а таксама кніжная выстава, прысвечаная Году кнігі, прэзентацыі беларускіх выдавецтваў, часопісаў, газет і многае іншае.

Запамінальна прайшлі сустрэчы чытачоў з творцамі. На Мядзельшчыну прыехалі такія вядомыя паэты, пісьменнікі і даследчыкі, як Генадзь Пашкоў, Мікола Мятліцкі, Мікола Шабовіч, Дзмітрый Пятровіч, Мікола Мікуліч, Віктар Шніп, Алесь Бадак, Таццяна Сівец, Анатоль Бутэвіч, Вячаслаў Рагойша.

Асноўная дзея свята паэзіі і песні прайшла ў гарадскім амфітэатры. Гасцей віталі міністр культуры Беларусі Павел Латушка, намеснік старшыні Мінаблвыканкама Віктар Шчэцька, старшыня Мядзельскага райвыканкама Аляксандр Даніленка. Намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Юрый Ізюмаў прэзентаваў паштовую марку спецыяльнага выпуску да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка, афіцыйныя асобы прынялі ўдзел у цырымоніі яе гашэння.

На сцэне амфітэатра выступілі вядомыя беларускія спевакі і артысты Марыя Захарэвіч, Алег Сямёнаў, На-дзея Мікуліч, Дзмітрый Качароўскі, ансамбль «Грамніцы», вакальны калектыў «Верасень», Аляксандра і Канстанцін, Дзяржаўны ансамбль «Свята» і многія іншыя.

Уразілі жыхароў і гасцей Мядзела шматлікія творчыя нумары дзіцячых і дарослых мастацкіх калектываў, кірмаш-продаж прадукцыі гандлёвых прадпрыемстваў горада і раёна, выстава-кірмаш вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і промыслаў з майстар-класамі.

Паэзія Максіма Танка захапляе шматлікасцю тэм, вобразаў і форм, яна яркая, эмацыянальная, па-філасофску глыбокая і вельмі лірычная. Галоўная тэма, якая

пранізвае яго творчасць, — любоў да сваёй Радзімы. Арганізатарам удалося ўвасобіць гэтыя адметныя рысы ў праграме свята, паказаць сапраўдную пашану да асобы і дзейнасці майстра, а таксама шматграннасць творчых накірункаў, якія развіваюцца сёння.